20. Магистерский диспут Д.Г.Коновалова в Московской Духовной Академии (24 октября 1908 года). – Сергиев Посад: Типогр. Св.- Троицкой Сергиевой Лавры, 1909. – С. 30.
21. Варжанский Н. Доброе исповедание: (Православный противосектантский учебник для катехизации народа, редактированный Высокопреосвященнейшим Антонием Архиепископом Волынским) / Н.Варжанский. – 4-е изд., испр. иллюстр. катакомбами другими снимками и доп. изд. прот. Неофита Порф. Любимова (стереотип). – М.: Русская Печатня, 1914. – С.III.

**SUMMARY**
**Olga Pidluzhna**
**ANTYSECTANT MISSIONARY WORK OF THE RUSSIN ORTHODOX CHURCIN IN VOLHYNIA (THE END OF XIX - THE 1920S OF THE TWENTIETH CENTURY.)**
In the article attempts are made to explore the causes of antysectant Orthodox Missiology. The level of influence and significance of these works are analyzed for practical missionary work.
Keywords: Orthodox Missiology, shtundyzm, motivation and dynamics of religious conversions, missionary conventions, antysectant activity.

***Алена Філатава***

# ТАТАРЫ-МУСУЛЬМАНЕ ЗАХОДНІХ ГУБЕРНЯЎ

На думку автора, завдяки ісламу татарський народ західних губерній Російської імперії уник асиміляції у християнському середовищі. Основним напрямом політики уряду щодо мусульман цих губерній була уніфікація управління цією конфесією за зразком православної церкви. Внаслідок цього склалася така структура управління: імператор – департамент духовних справ іноземних віросповідань МВС – Таврійське магометанське духовне правління – мулла – мусульманська парафія.
*Ключові слова: іслам, західні губернії Російської імперії, мусульмани, Таврійське магометанське духовне правління.*

Змяненне дзяржаўнасці ставіць на першае месца цікавасць да асноўнай нацыі новай краіны. Але яе гісторыя цесна пераплецена з гісторыяй ўзаемаадносін гэтай нацыі з нацыянальнымі меншасцямі, якія не адно стагоддзе жылі на гэтай тэрыторыі і ўплывалі друг на друга, карыстаючыся элементамі культуры, языка, традыцыі і г. д. Таму натуральна цікавасць у 90-х гг. XX ст. да гісторыі не толькі беларускага народа, але і рускага, украінскага, польскага, літоўскага, латышскага, татарскага і інш.

Цікавасць да гісторыі татар-мусульман, так званых “літоўскіх татар”, пачалася яшчэ ў першай палове XIX ст. і працягвалася ў 20 – 30-х гг. XX ст.

Адным з цікавых выданняў гэтага часу была праца С. Крычынскага[1]. Калі паглядзець даследванні польскіх гісторыкаў аб татарах-мусульманах, надрукаваных на працягу 80–90-х гадоў XX – пачатку XXI ст., то пералік іх будзе даволі значным, асабліва ў параўнанні з нашай гістарыяграфіяй. Сярод іх працы П. Бараўскага, Я. Тышкевіча, У. Бараноўскага, А. Дразда, Т. Майды і М. Дзякана[2] і іншыя. Даследчыкі разглядаюць розныя аспекты жыцця татарскага насельніцтва, такія як прававыя, рэлігійныя, сацыяльныя, адукацыю мусульманскага насельніцтва, паходжанне татарскіх радоў і іншыя.

Першымі ў беларускай гістарыяграфіі гэтага часу сталі артыкулы беларускага гісторыка І. Канапацкага і літоўскай даследчыцы Т. Байрашаўскайце[3], якія былі прысвечаны гісторыі татарскага насельніцтва. Яны прыцягнулі ўвагу, у першую чаргу, да мусульманства, як да незвычайнай для Беларусі і Літвы рэлігіі, нягледзячы на 600-гадовае знаходжанне татар-мусульман на гэтай тэрыторыі.

Вывучэнню гісторыі татар-мусульман садзейнічалі і канферэнцыі, якія праводзіліся з 1993 г., па ініцыятыве беларускага аб’яднання “Аль-Кітаб”. Шэраг даследчыкаў з Польшчы, Літвы, Расіі і Украіны запаўнялі прабелы цікавымі матэрыяламі. Гісторыі гэтага народу прысвечаны працы С. Думіна і І. Канапацкага, а таксама А. Смоліка і І. Канапацкага[4]. Узаемаадносіны паміж царскім урадам і мусульманамі беларуска-літоўскіх губерняў разгледжаны А. Філатавай ў калектыўнай працы “Канфесіі на Беларусі” і манаграфіі[5].

Па 6 заходних губернях Расійскай імперыі колькасць татар-мусульман была 5485[6]. Па дадзеным перапісу 1897 г. у заходніх губернях налічвалася 13877 мусульман[7]. Мусульмане жылі ў Віленскай, Гродзенскай, Мінскай, Ковенскай, Віцебскай губернях, невялікая колькасць - ў Валынскай губерні.

У канцы XVIII – пачатку XIX ст. у Расійскай імперыі адбываліся пошукі найбольш аптымальных (на думку ўлад) шляхоў рэарганізацыі органаў кіравання канфесіямі. У 1810 г. было заснавана Галоўнае ўпраўленне духоўнымі справамі замежных веравызнанняў. Згодна Зводу законаў 1832 г. дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў канчаткова быў уключаны ў склад Міністэрства ўнутраных спраў.

У пачатку XIX ст. урад спрабаваў падпарадкаваць мусульманскае насельніцтва заходніх губерняў Арэнбургскаму духоўнаму праўленню. У 1803 г. мусульмане звярнуліся да міністра духоўных спраў графа В. Качубея з прашэннем, у якім указвалася, што «они со времени водворения своего в Литве через 500 лет, в силу привилегий от польских королей им дарованных … никакому муфтию подчинены не были» і прасілі пазбавіць іх ад гэтага[8].

Становішча змянілася ў 30-я гг., калі па палажэнні аб Таўрычаскім магаметанскім духоўным праўленні ад 23 снежня 1831 г. яму пачалі падпарадкоўвацца мусульмане заходніх губерняў. Мусульмане заходніх губерняў ніколі не мелі сваіх прадстаўнікоў у гэтым праўленні. Яны звярталіся туды выключна для зацвярджэння выпісак з метрычных кніг, па пытаннях, звязаных з асобамі кандыдатаў на пасаду мулы і яго памочнікаў, іншы раз па шлюбных справах[9].

Як духоўныя асобы Таўрычаскай магаметанскай акругі, так і мулы заходніх губерняў, на час знаходжання на пасадзе, былі вызвалены ад падаткаў і павіннасцяў. Але спецыфіка мусульманскага духавенства заходніх губерняў была ў тым, што яны, асабліва ў першай палове XIX ст., належалі толькі да дваранскага саслоўя і карысталіся яго правамі. Па палажэнню аб таўрычаскім мусульманскім духавенстве (ад 23 снежня 1831 г.) у званні хатыма, імамаў і мул павінны былі выбірацца асобы, якія належалі да таўрычаскага духавенства. Аднак, Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне сутыкнуўшыся з прыналежнасцю мул заходніх губерняў да дваранства, хадайнічала перад дэпартаментам духоўных спраў замежных веравызнанняў МУС аб дазволе выбіраць ў гэтых губернях асоб з "людей всякого состояния"[10].

Пры абмеркаванні гэтага пытання 28 чэрвеня 1849 г. Гродзенскі грамадзянскі губернатар напісаў Віленскаму ваеннаму, Гродзенскаму, Мінскаму і Ковенскаму генерал-губернатару, што «назначение для здешних губерний татар духовников из жителей Таврической было бы совершенно неудобным, так как здешние татары не знают арабского языка», акрамя таго іх рэлігійныя звычаі адрозніваюцца ад звычаяў таўрычаскіх татар[11]. 14 чэрвеня 1870 г. была зацверджана думку Дзяржаўнага Савета аб тым, што хатыпы, імамы і мулы, якія належалі да акругі Таўрычаскага магаметанскага духоўнага праўлення прыводзяцца да прысягі ў павятовых паліцэйскіх упраўленнях[12].

Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў МУС у Пецярбургу, Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне ў Сімферопалі, губернскія праўленні у Вільні, Мінску, Гродне, Коўна, у асноўным, разглядалі справы, якія былі звязаны з будаўніцтвам або рамонтам мячэцяў у заходніх губернях, скаргі прыхаджан, якія былі не згодны з выбраннем мулы або з дзейнасцю некаторых духоўных асоб. Але з-за вялікай адлегласці паміж гэтымі гарадамі вырашэнне спраў зацягвалася. Таму 15 ліпеня 1842 г. мусульмане (1400 чал.) з беларуска-літоўскіх губерняў звярнуліся да міністра унутраных спраў з просьбай аб заснаванні асобнага духоўнага праўлення ў заходнім краі і прызначэнні асобнага муфція. Але

гэтае пытанне не было вырашана[13]. У 1891 г. было пачата пераўтварэнне Таўрычаскага магаметанскага духоўнага праўлення. Меркавалася забраць татар заходніх губерняў з гэтага праўлення і падпарадкаваць іх мул агульнаму грамадзянскаму кіраванню. Але, разгледзеўшы гэтую справу, вырашылі пакінуць іх пад кіраўніцтвам праўлення[14].

Паводле указа ад 14 снежня 1837 г. выбранне мул і іншых мусульманскіх асоб па прыходах павінна было адбывацца па жаданні не менш 2/3 прыхаджан, якія лічыліся старэйшынамі сям'і. У выбарах не маглі ўдзельнічаць асобы, якія не належалі да прыхода, а таксама малодшыя члены сям'і (сыны, што жылі разам з бацькамі, самыя меншыя браты, пляменнікі і г.д.). Прыгавор грамадства аб выбранні мулы падпісваўся мясцовымі ўладамі, а затым прадстаўляўся ў Таўрычаскае духоўнае праўленне, якое звярталася за канчатковым зацвярджэннем да губернскага праўлення[15].

Пасля заканчэння Крымскай вайны (1853 – 1856 гг.) ўзнікла неабходнасць у збіранні звестак аб мячэцях, колькасці прыхаджан, мусульманскім духавенстве, вучэбных установах. На пасяджэнні Таўрычаскага магаметанскага духоўнага праўлення ад 6 чэрвеня 1856 г. было пранятае рашэнне звярнуцца з гэтай просьбай не толькі да кадзіяў Крыма, але і ў Мінскае, Гродзенскае, Валынскае, Падольскае і Ковенскае губернскія праўленні. Усяго па звесткам, якія атрымала Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне у 1856 – 1857 гг. у Гродзенскай, Ковенскай, Падольскай і Мінскай губернях дзейнічала 11 мячэцей, з агульнай колькасцю прыхаджан больш 2200 чал.[16].

У канцы XVIII ст. мусульманская канфесія ў беларуска-літоўскіх губернях мела сетку мячэцяў. Вакол іх групаваліся татарскія абшчыны і пачалі фарміравацца мусульманскія прыходы. Утрыманне мячэцей ажыццяўлялася з бліжэйшых татарскіх маёнткаў, або на ахвяраванні прыхаджан. Некаторыя з татар пакідалі тастаменты на карысць мячэцей і мул. Вядомымі фундатары мячэцяў: А.Асановіч, Я. Якубоўскі, А. Юзефовіч, Я. І С. Крачкоўскія, Ф. Пуслоўскі, Радзівілы, Э. Замойская, П. і Э. Манюшкі[17].

Крыніцы даходаў мячэцяў былі розныя. Так, татары Даўбуцішскага сходу павінны былі плаціць мячэці асобны падатак, які ў 1802 г. увёў мула Якуб Лебедзь. Акрамя таго, на карысць мячэці збіраліся пасашковыя па два злотых ад кожнай працоўнай сахі. Даходы павялічваліся і за кошт спадчынных дараванняў. Так, у 1805 г. Ян Крычынскі даў муэдзіну Даўбуцішскай мячэці Якубу Радкевічу пісьмо, якім завяшчаў у вечнае карыстанне свае пабудовы, палі і агароды. У 1891 г. такое ж пісьмо на 0,5 дзес. зямлі даў мячэці ад сябе і свайго брата Эміяз Юшынскі, а ў 1913 г. Бекір Шабановіч пакінуў мячэці ў Мураўшчызне частку сенажаці[18].

На заходнія губерні быў распаўсюджаны ўказ ад 26 жніўня 1755 г., згодна з якім мусульманскі прыход павінен мець не менш чым 200 душ мужчынскага полу, толькі тады яму было дазволена будаваць новую мячэць. Прьгхажане павінны былі мець дастаткова сродкаў на будаўніцтва, а таксама на ўтрыманне духавенства. Згодна з указам ад 13 снежня 1817 г. мячэць павінна была будавацца сярод сялення, у месцы, якое з усіх бакоў было адчынена, і па плане, узгодненым з грамадзянскімі ўладамі. Па Будаўнічай Уставе 1900 г. новыя мячэці, будаўніцтва якіх было прызнана адпаведнымі духоўнымі і грамадзянскімі ўладамі і забяспечаныя ўтрыманнем будуюцца па планам, якія прыхаджанамі будуць прызнаны “удобными”. Пры гэтым вытрымліваюцца наступныя правілы: каб прыхаджан было не менш чым 200 душ муж. п.; каб грамадства заявіла ў грамадскім прыгаворы сваю згоду на дастаўку сродкаў для забеспячэння ўтрымання мячэці і неабходнага пры ёй духавенства[19].

У сувязі з тым, што мулы знаходзіліся на ўтрыманні сваіх прыхаджан, некаторыя прыходы рабілі спробы дамовіцца з уладамі, каб іх духавенства атрымлівала грошы ад казны. Напрыклад, у ліпені 1882 г. гэта зрабілі прыхаджане Асмалоўскай саборнай мячэці. Сваю просьбу яны матывавалі тым, што ў войсках, якія былі раскватараваны на тэрыторыі павета, былі мусульмане з іншых губерняў. Яны звярталіся да мясцовага мулы па духоўных справах або выклікалі яго да сябе, што прыводзіла да непрадбачаных расходаў. Мінскае губернскае праўленне нагадала, што згодна з арт. 1200, т. 11 указаў дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў МУС будаванне мячэцяў дазваляецца толькі пры забеспячэнні ўтрымання іх і духавенства. Гэта забеспячэнне цалкам ляжала на прыхаджанах. Згодна з арт. 1198 і 1203 тых жа ўказаў Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне павінна было клапаціцца аб прыстойным утрыманні мячэцяў. Галоўным сродкам для гэтага служылі нерухомая маёмасць (вакуфы) і грашовыя капіталы, якія знаходзіліся ў падпарадкаванні праўлення[20].

25 мая 1881 г. прыхаджане Слонімскай мячэці звярнуліся да міністра ўнутраных спраў за грашовай дапамогай на адбудаванне пасля пажару будынка. У прашэнні яны пісалі, што “магаметанскае духавенства і мячэці ў Паўночна-Заходнім краі згодна з законам існуюць выключна на лепту прыхаджан, якія, будучы абкладзены зборам на хрысціянскае духавенства і цэрквы”, не мелі дастаткова грошай. 21 сакавіка 1883 г. дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў звярнуўся ў Таўрычаскае духоўнае праўленне, каб тое выдзеліла грошы за кошт вакуфаў і грашовых капіталаў, што і было зроблена. Па просьбе гродзенскага губернатара ад

20 красавіка 1909 г. Міністэрства ўнутраных спраў дазволіла дваранам-мусульманам збіраць грошы на рамонт Крушнянскай мячэці (у прыходзе было 300 прыхаджан)[21].

Духоўныя асобы мусульманскіх абшчын не атрымлівалі грашовых субсідый з дзяржаўнай казны, а таму павінны былі прытрымлівацца за кошт сваіх вернікаў. Члены абшчын неаднаразова звярталіся да ўлад з просьбай аб аказанні грашовай дапамогі. Напрыклад, 1 ліпеня 1882 г. прыхаджане Асмалоўскай мячэці прасілі аб прызначэнні іх імаму грашовай дапамогі. Гэтую просьбу яны матывавалі значнымі выдаткамі ў яго дзейнасці па задавальненню духоўных патрэбаў мусульман. Акрамя татарскага насельніцтва ён апекаваўся таксама і над вайскоўцамі-мусульманамі, што праходзілі службу ў мясцовых гарнізонах. Аўтары прашэння падкрэслівалі, што яны і іх адзінаверцы, як і ўсе астатнія падданыя Расійскай імперыі, плацяць у казну пазямельны збор на святарства, тым не менш іх святары не атрымліваюць пенсій з казны. Але спачатку губернскія ўлады, а затым і міністэрства ўнутраных спраў адмовілі асмалоўскім мусульманам з нагоды, што ўтрыманне мусульманскага святарства за кошт казны не прадугледжана дзеючым заканадаўствам[22].

Мячэці падзяляліся на саборныя і пяцічасавыя. Паводле тлумачэння дэпартамента духоўных спраў замежных веравызнанняў “адрозненне гэта мела значэнне выключна ў духоўных адносінах”. У саборных мячэцях адбываліся наогул усе службы, як штодзённыя, так і пятнічныя і святочныя. Пяцічасавыя ж мячэці атрымалі сваю назву ад таго, што мусульмане збіраліся ў іх для малітвы штодзённа пяць раз. Але ў іх не праводзіліся богаслужэнні па пятніцах і ў святочныя дні. У архітэктурных адносінах саборныя і пяцічасавыя мячэці адрозніваліся паміж сабой у асноўным толькі памерамі. У 1879 г. у Віленскай губерні меліся тры саборныя і тры пяцічасавыя мячэці з 2529 прыхаджанамі, у Мінскай — восем саборных з 3145 прыхаджанамі, у Гродзенскай — тры саборныя з 1652 прыхаджанамі. У пачатку XX ст. на тэрыторыі Беларусі дзейнічала больш 20 мячэцей[23].

У 60-х гг. XIX ст. у Мінскай губерні былі Ўздзенскі прыход (100 чал. прыхаджан); Смілавіцкі (482), Навагрудскі (333 муж. п.), Лоўчыцкі (100 чал.), Мірскі (25 чал.), Ляхавічскі (385 муж. п.), Асмалоўскі (504 муж. п.)[24] і інш. У XIX ст. у беларуска-літоўскіх губернях было 20 мусульманскіх прыходаў[25].

Спрочным было пытаннем аб прыналежнасці татар-мусульман да шляхецкага стану у Рэчы Паспалітай, дзе іншаверцы не маглі займаць дзяржаўныя пасады. Пасля яе падзелаў царскія ўлады зыходзячы з прадпасылкі, што значная частка татарскага насельніцтва карысталася правамі шляхты аднеслі ўсё мусульманскае грамадства да шляхецкага

стану. Татары, у якасці паўнапраўных членаў былі дапушчаны да ўдзелу ў дваранскіх выбарах у 1809 г. у Вільні і 1810 г. – у Гродне. Толькі ў 1824 г. губернскія ўлады звярнулі ўвагу на тое, што мусульмане прыносяць прысягу ў каталіцкім касцёле. Прадвадзіцель дваранства Гродзенскай губерні князь К. Чатверцінскі апраўдваўся тым, што ў прадпісаным абрадзе для правядзення дваранскіх выбараў не было прадугледжана правіла, каб "татары, имеющие голоса в дворянских собраниях, приводились к присяге по магометанскому обряду в мечети или в присутствии муллы". У выніку ўмешацельства ўлад было загадана, каб "впредь татар приводить к присяге на Алькоране"[26]. Указам ад 25 чэрвеня 1840 г. дваранам-мусульманам гэтых губерняў было дазволена мець маёнткі, валодаць прыгоннымі сялянамі-хрысціянамі і трымаць іх для паслуг па найме. Ва ўсёй імперыі гэта было наогул забаронена дваранам-нехрысціянам[27].

Нягледзячы на тое, што татары зберагглі сваю рэлігію, яны засвоілі, асабліва мусульманскае дваранства, польскую мову. Так, 10 лютага 1866 г. віцебскі губернатар генерал Вяроўкін адзначаў, што татары зберагглі сваю рэлігію, засвоілі сабе мову і звычаі больш польскія, чым рускія[28]. У 80-я гг. мусульманам было забаронена весці богаслужэнне і чытаць рэлігійныя кнігі на польскай мове. З гэтай нагоды віленскі, ковенскі і гродзенскі генерал-губернатар 27 снежня 1886 г. пісаў міністру ўнутраных спраў аб тым, што мула Слонімскай мячэці Багушэвіч у час Байрама пры правядзенні богаслужэння выкарыстоўваў польскую мову. Гэтыя звесткі былі правераны і выявілася, што Багушэвіч усе малітвы на святкаванні Байрама гаварыў на польскай гутарковай мове і што "ўсе магаметане Паўночна-Заходняга краю настолькі засвоілі гэтую мову, што лічаць яе прыроднай мовай, што пацвярджае і распаўсюджванне ў асяроддзі магаметан Алкарана, перакладзенага на польскую мову... Я прызнаю немагчымым дапусціць на будучы час выкарыстанне імамамі пры богаслужэнні польскай мовы і зрабіў да выканання гэтага неабходныя распараджэнні"[29].

Як і сярод іншых канфесій, адбываліся пераходы з мусульманства ў праваслаўе альбо ў каталіцтва, хаця гэта былі адзінкавыя выпадкі, бо аднаверцы дрэнна ставіліся да тых, хто мяняў сваю веру. Так, у 1852 г. прасіў дазволу ў міністра ўнутраных спраў аб пераходзе з мусульманства ў каталіцтва 27-гадовы калежскі рэгістратар Іосіф Абрагімовіч, які быў ахрышчаны 17 студзеня 1854 г.[30]. У красавіку 1879 г. , у Брэсцкім павеце Гродзенскай губерні быў забіты ваеннаслужачы Абдурахманаў. У рапарце паліцэйскага ўпраўлення губернатару паведамілі, што прычынай яго смерці стала насілле з боку адзінаверцаў-мусульман, у сувязі з тым, што Абдурахманаў прыняў праваслаўе[31].

Дзякуючы ісламу татарскі народ пазбег асіміляцыі ў асяроддзі хрысціянскага насельніцтва. Добрыя ўзаемаадносіны татарскага народа з іншымі народамі ў беларуска-літоўскіх губернях, чаму нямала спрыялі працавітасць і маральнасць мусульман, вялі да добрых адносін і да канфесіі наогул. А ў сувязі з тым, што канфесія была нешматлікай, царскі ўрад не рабіў рэлігійных абмежаванняў. Рэдкія пераходы з мусульманства ў хрысціянства былі абумоўлены павагай татар-мусульман да сваёй рэлігіі і звычаяў; адсутнасцю з боку дзяржавы і праваслаўнага духавенства ў беларуска-літоўскіх губернях якой-небудзь мэтанакіраванай працы па пераводу мусульман гэтых губерняў у хрысціянства.

Асноўнымі накірункамі палітыкі ўраду адносна мусульман заходніх губерняў у 1793–1905 гг. былі: уніфікацыя кіравання і ўсталявання структуры гэтай канфесіі. У выніку чаго склалася наступная структура кіравання: імператар – дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў МУС – Таўрычаскае магаметанскае духоўнае праўленне – мула-мусульманскі прыход. Мула практычна быў набліжаны па сваім правам да духоўнага саслоўя.

1. Kryczyński S. Tatarzy Litewscy //Rocznik Tatarski. – 1938. –T. 3.
2. Borawski P., Dubinski A. Tatarzy Polscy. Dzieje obrzedy. Legendy. Tradycji / P. Borawski, A. Dubinski. – Warszawa, 1986; Tyszkiewicz J. Tatarzy na Litwie i w Polsce/ J. Tyszkiewicz. – Warszawa, 1989; Baranowski W. Swiat islamu / Baranowski W. - Lodz, 1987; Tyszkiewicz J. Z historii tatarów Polskich. 1794–1944/ J. Tyszkiewicz/ – Pułtusk., 1998; Drozd A., Dziekan M.M., Majda T. Meczety i cmentarze tatarów polsko-litewskich./ A. Drozd, M. M. Dziekan, T. Majda. –Warszawa: „Res Publika Multiethnica", 1999 і іншыя.
3. Байрашаускайте Т. Сохранность сети мусульманских святилищ на территории Северо-Западного края в X1X в. //Наш радавод. – 1992. – Кн. 4. Ч. 1. – С. 191–196; Канапацкі І. Да пытання аб нацыянальнай літаратуры беларускіх татар. // Наш радавод. – 1992. – Кн. 4. Ч. 1. – С. 498–503.
4. Думін С. У., Канапацкі І. Б. Беларускія татары. Мінулае і сучаснасць./С. У. Думін, І. Б. Канапацкі. – Мінск: "Полымя", 1993; Канапацкі І. Б., Смолік А. І. Гісторыя і культура беларускіх татар. /І. Б. Канапацкі, А. І. Смолік. – Мінск: Бел. Ін-т культуры, 2000.
5. Грыгор'ева В., Завальнюк У., Навіцкі У., Філатава А. Канфесіі на Беларусі./ В. Грыгор'ева, У. Завальнюк, У. Навіцкі, А. Філатава. – Мінск: "Экаперспектыва", 1998; Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. /Е. Н. Филатова. – Минск: «Белорусская наука», 2006.
6. Мухлинский А. Исследование о происхождении и состоянии литовских татар./ А. Мухлинский – СПб, 1857. – С. 42.
7. Грыгор'ева В., Завальнюк У., Навіцкі У., Філатава А. Канфесіі на Беларусі./ В. Грыгор'ева, У. Завальнюк, У. Навіцкі, А. Філатава. – Мінск: "Экаперспектыва", 1998. – С. 150.

8. Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. /Е. Н. Филатова. – Минск: «Белорусская наука», 2006. – С. 40.
9. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у С.-Пецярбургу (далей – РДГА у С.-Пецярбургу). – Ф. 821. – Воп. 8. – Спр. 686. – Арк.102 аб., 103.
10. Гістарычны архіў Літвы (далей ГА Літвы). – Ф. 378. – а/п. – 1849. – Спр. 1747. – Арк. 110.
11. Там жа. – Арк.118.
12. Полное собрание законов Российской империи. – Собр. 2. – Т. XLV. – Отд. 1. – СПб., 1874. – С. 820.
13. Филатова Е. Н. Конфессиональная политика царского правительства в Беларуси. 1772–1860 гг. /Е. Н. Филатова. – Минск: «Белорусская наука», 2006. – С. 60.
14. РДГА ў С.-Пецярбургу. – Ф. 821. – Воп. 8. – Спр. 686. – Арк. 95.
15. Грыгор'ева В., Завальнюк У., Навіцкі У., Філатава А. Канфесіі на Беларусі./ В. Грыгор'ева, У. Завальнюк, У. Навіцкі, А. Філатава. – Мінск: "Экаперспектыва", 1998. – С. 147.
16. Абдулаев И. Конфессиональные связи татар Литвы, Белоруссии и Украины с Таврическим магометанским духовным правлением в середине XIX века. // Другая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя "Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі" . – Ч.1. – Минск, 1996. – С. 82.
17. Канапацкая З. Мечети как центры этноконфессиональной культуры татар Беларуси, Литвы и Польши //Ислам и мусульмане Беларуси в XX веке. – Минск, 2002. – С. 143–144.
18. Грыгор'ева В., Завальнюк У., Навіцкі У., Філатава А. Канфесіі на Беларусі./ В. Грыгор'ева, У. Завальнюк, У. Навіцкі, А. Філатава. – Мінск: "Экаперспектыва", 1998. – С. 148.
19. Свод Законов Российской Империи. – Т. XII. – Ч. I. – СПб., 1900. – С. 35–36.
20. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Мінску (далей НГАБ у Мінску). – Ф. 299. Воп. 2. – Спр. 8083. – Арк.27, 24, 25.
21. РДГА у С.-Пецярбургу. – Ф. 821. – Воп. 8. – Спр. 686. – Арк.1.
22. НГАБ у Мінску. – Ф. 299. – Воп. 2. – Спр. 8083. – Арк. 27 аб., 29, 30.
23. Байрашаускайте Т. Сохранность сети мусульманских святилищ на территории Северо-Западного края в Х1Х в. //Наш радавод. – 1992. – Кн. 4. Ч. 1. – С. 195, 196; Канапацкая З. Мечети как центры этноконфессиональной культуры татар Беларуси, Литвы и Польши //Ислам и мусульмане Беларуси в XX веке. – Минск, 2002. – С. 140.
24. РДГА ў С.-Пецярбургу. – Ф. 821. – Воп.8. – Спр. 686. – Арк. 17, 112 аб.
25. Акты издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов. Т. 31. Акты о литовских татарах (1521–1784). – Т. 31. – Вильна, 1906. – С. XXV.
26. Байрашаускайте Т. Литовские татары в дворянских собраниях XIX века // Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемаадносіны з беларускай і іншымі культурамі. – Ч. 1. – Мінск, 1996. – С. 136.

27. Рубинштейн С. Ф. Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малоруссии за 240 лет с 1652 по 1892 г. / С. Ф. Рубинштейн. – Вильно, 1894. – С. 494.
28. Kryczyncki L. Tatarzy Litewscy w wojcku polskim w powstanni 1831 r. / L. Kryczyncki/ – Warszawa, 1932. – Ń. 54.
29. Kryczyński S. Tatarzy Litewscy //Rocznik Tatarski. – 1938. – T. 3. – S. 49; РДГА у С.-Пецярбургу. – Ф. 821. Воп. 8. – Спр. 686. – Арк. 94.
30. НГАБ у Минску. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1224. – Арк. 14, 5, 8; 11; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродна. – Ф. 1. – Воп. 1. – Спр.3046. – Арк. 1.
31. Линкевич В. Мусульманство в Беларуси (вторая половина XIX – начало XX вв.) // Мечети и мизары татар Беларуси, Литвы и Польши. – Новогрудок, 2002. – С. 30–31.

**SUMMARY**
**Elena Filatova**
**MUSLIM TATARS IN THE WESTERN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE**
Thanks to Islam Tatar people of the Western provinces of the Russian Empire escaped assimilation within the Christian environment. Unification of the denomination governance according the Orthodox Christian Church model was the main direction sate policy towards Muslim people in these provinces. As a result, the following administrative structure had been developed: the Emperor - the Department of Religious Affairs of Foreign Confessions (Ministry of Foreign Affairs) - Tauride Mohammedan Spiritual administration - Mullah - a Muslim congregation.
Keywords: Islam, the Western provinces of the Russian Empire, Muslim people, Tauride Mohammedan Spiritual administration.

***Oxana ZEMTSOVA***

# ISMAIL GASPRINSKII AND THE BIRTH OF JADIDISM AMONG MUSLIM TATARS

Стаття присвячена виникненню новометодного руху серед мусульман Російської імперії, який був заснований Ісмаілом Гаспрінським в Бахчисараї в Криму. Дослідження показує як реформи в освіті поширились на повсякденне життя мусульман Російської імперії та стали символом мусульманського націоналізму, який зароджувався.
*Ключові слова: мусульмани, націоналізм, освіта, джадидизм.*

The problem of *jadidism,* a Muslim movement that appeared in the second half of the 19$^{th}$ century in the Crimea, and gradually spread onto all the other 'Muslim' regions of the empire, has a diverse and multileveled historiography. Kemal Karpat's presentation of Russia's Eastern provinces as likely targets for